степенно меняется. И, тем не менее, значительная часть населения нашей страны дает предпринимательству пока что нелестную оценку («спекулянты», «жулики», «рвачи» и т.п.). Для того чтобы сломать устоявшиеся стереотипы мышления отечественные предприниматели должны повышать культуру ведения бизнеса. Но им должно помогать и государство. И речь идет не только об экономической и юридической, но и идеологической поддержке. Государству нужно настойчивее говорить о том, что белорусский бизнес должен и может быть надежным социальным партнером в деле повышения благосостояния народа, модернизации экономики страны.


Литература:

1. Кант, И. Основы метафизики нравственности/Кант И. //Сочинение в 6-ти т., т.4, ч.1 – М., 1965.


## ЖЫЛЛЁВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ СТАХАНАЎЦАЎ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х гг.


Субоцін А.А.,

асістэнт УА “ВДТУ”, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – Космач В.А., доктар гіст. навук, прафесар


Праблема забеспячэння насельніцтва жыллём і яго набыцця з’яўляецца адной з самых распаўсюджаных у беларускім грамадстве. Сучаснае жыллёвае пытанне патрабуе разгляду яго спецыфікі ў гістарычным мінулым. Асабліва востра гэта пытанне стаяла ў савецкі перыяд, што было звязана з працэсам індустрыяльнага будаўніцтва і высокім узроўнем урбанізацыі ў БССР. У дадзеных умовах дзяржава пачала праводзіць актыўную жыллёвую палітыку ў адносінах да рабочых, сярод якіх асаблівая ўвага надавалася забеспячэнню жыллём удзельнікаў стаханаўскага руху як перадавікаў вытворчасці.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца выяўленне асаблівасцяў жыллёвай палітыкі дзяржавы ў адносінах да стаханаўцаў БССР у другой палове 1930-х гг.

Пры даследаванні адзначанай праблемы намі былі скарыстаны агульнанавуковыя метады ідэалізацыі, параўнання і абагульнення, спецыяльныя гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны метады.

У працэсе развіцця стаханаўскага руху дзяржава адным з накірункаў сваёй сацыяльнай палітыкі ў якасці сродка яго разгортвання лічыла рашаючае паляпшэнне жыллёвых умоў стаханаўцаў. Калі за кошт павышэння сваёй заработнай платы стаханаўцы маглі ў цэлым самі ўладкоўваць сваю хатнюю гаспадарку, забяспечваць сябе харчаваннем і ўсімі неабходнымі рэчамі, то вырашэнне жыллёвага пытання перадавікоў цалкам знаходзілася пад кантролем дзяржавы.

Павысіўшы сваё матэрыяльнае становішча, працоўныя, якія ўключыліся ў стаханаўскі рух, у першыя месяцы яго развіцця, аднак, часта сутыкаліся з жыллёвай праблемай. Напрыклад, адна з работніц фабрыкі “КІМ” Цыплякова, стаўшы адной з знакамітых стаханавак рэспублікі ў пачатку кастрычніка 1935 г., у канцы гэтага ж месяца яшчэ пражывала ў памяшканні былой гандлёвай лаўкі [1, арк. 114]. Прафсаюзная арганізацыя Віцебскага шчоткамбіната ў сваёй справаздачы ад 25 снежня 1935 г. аб культарна-бытавым абслугоўванні стаханаўцаў указвала, што самы значным недахопам у гэтай сферы было вырашэнне пытання аб прадастаўленні жыллёвай плошчы [2, арк. 307].

Але ў далейшым у ходзе разгортвання стаханаўскага руху дзяржава імкнулася задавальняць жыллёвыя патрэбы перадавікоў. Перш за ўсё вылучаліся пакоі ў інтэрнатах, уладкаваныя спецыяльна для стаханаўцаў. Удзенскім леспрамгасам, напрыклад, у інтэрнат у сярэдзіне 1936 г. было заселена 8 стаханаўцаў дадзенага прадпрыемства [3, арк. 44]. Для стаханаўцаў Барысаўскай запалкавай фабрыкі ў інтэрнаце быў арганізаваны асобны пакой лепшых стаханаўцаў [4, с. 10]. Так адміністрацыя некаторых прадпрыемстваў пры немагчымасці вылучыць асобнае жыллё перадавікам, стварала для іх спрыяльныя камунальныя ўмовы ў інтэрнатах, дзе статус стаханаўцаў вызначаўся пражываннем у лепшых пакоях.

У большасці жа выпадках стаханаўцы першачаргова перасяляліся ў асобныя кватэры. У студзені 1936 г. у добра ўладкаваную кватэру з барака была пераведзена

лепшая стаханаўка Аршанскага льнокамбіната Батурына [1, арк. 12]. Для лепшых стаханаўцаў Віцебскага малпрамтрэста пад кватэры ў кастрычніку 1935 г. былі куплены 2 дамы [5, арк. 33].

У рамках палітыкі па паляпшэнню жыллёвых умоў стаханаўцаў спецыяльна для іх пачалі будаваць шматкватэрныя дамы. Да канца красавіка 1936 г. планавалася закончыць узвядзенне двухпавярховага дванаццацікватэрнага дома для стаханаўцаў торфзавода "Чырвоны сцяг" (Смалявіцкі раён) [6, с. 4]. У выпадках жа, калі стаханаўцы самі будавалі сабе жыллё, то ім вылучаліся грашовыя сродкі для такога будаўніцтва. Так машыністу-стаханаўцу Самсонаву з Віцебскага чыгуначнага вузла для пабудовы дома было вылучана ад дзяржавы 3000 р. [7, с. 1].

Жыллёвая палітыка дзяржавы ў другой палове 1930-х гг. у адносінах да стаханаўцаў характарызавалася вылучэннем для іх у рабочых інтэрнатах лепшых узорных пакояў, пазачарговым перасяленнем у асобныя кватэры, пабудовай спецыяльных шматкватэрных дамоў, у якіх пражывалі толькі перадавікі вытворчасці, а таксама вялікай грашовай дапамогай для жыллёвага будаўніцтва. Усё гэта павінна было паспрыяць далейшаму ўключэнню ў стаханаўскі рух новых рабочых, стаць матэрыяльным стымулам да ўдасканалення працы. Больш таго станоўчае вырашэнне жыллёвых праблем для стаханаўцаў стала адным з фактараў іх фарміравання як своеасаблівай прывіліяванай катэгорыі рабочых, што мелі лепшыя жыллёва-камунальныя умовы, чым астатнія працоўныя пры агульнай невырашанасці жыллёвага пытання.


Літаратура:

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 265. - Воп. 1. – Спр. 4238
2. НАРБ. – Ф. 283. – Воп. 1. – Спр. 674
3. НАРБ. – Ф. 4-п. – Воп. 1. – Спр. 8961
4. Стаханаўскім шляхам. – Мн.: Дзяржвыд . Беларусі, 1936. – 64 с.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 932. – Воп. 1. – Спр. 349
6. Новыя культурна-бытавыя ўстановы // Звязда. – 1936. – 24 красавіка. – С. 4
7. Никогда так не жилось хорошо как теперь // Рабочий. – 1935. – 2 декабря. – С. 1


## УЧАСТИЕ ЗЕМЛЕУСТРОИТЕЛЬНЫХ КОМИССИЙ ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ В ДИНАМИКЕ СТОЛЫПИНСКИХ АГРАРНЫХ ПРЕОБРАЗОВАНИЙ


Таранович К.Ю.,

студентка 4 курса УО «БГПУ им. М. Танка», г. Минск, Республика Беларусь

Научный руководитель – Житко А.П., доктор ист. наук, профессор


Столыпинские аграрные преобразования оказали значительное влияние на экономическое и политическое развитие дореволюционной России. Земельная политика П.А. Столыпина не была случайностью, она ознаменовала собой сдвиг в сторону буржуазных механизмов в аграрных отношениях и должна была привести к перегруппировке классовых сил в деревне. В начале XX в. в обстановке спада революционного движения царское правительство спешно приступило к реформированию деревни по проекту, предложенному П.А. Столыпиным. Непосредственное осуществление столыпинских преобразований возлагалось на губернские и уездные землеустроительные комиссии, учреждённые указом Николая II от 4 марта 1906 г. Согласно указу, комиссии образовывались с целью оказания помощи Крестьянскому банку по содействию сельскому населению в покупке земель [1].

Актуальность изучения результативности аграрных преобразований землеустроительных комиссий в рамках столыпинской реформы обоснована неоднозначностью и противоречивостью позиций исследователей в отношении значения реформаторской деятельности П.А. Столыпина в исторической динамике земельных процессов на территории Беларуси. Также в последнее время в научной литературе высказывались новые подходы историков к оценке итогов реформы и её значения в улучшении условий крестьянского землевладения и землепользования, что даёт возможность взглянуть на деятельность землеустроительных комиссий с учётом новых фактов и меняющихся тенденций в исторической науке.